Н. І. ЛЯМЦАВА[1], Т. Р. ФЛЁРКА[2], Н. У. ГАДУНОВА[2]

# З ВОПЫТУ ВЫВУЧЭННЯ МІКРАТАПОНІМАЎ СЕЛЬСКІХ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

*[1]дУА «Сярэдняя школа № 66 г. Гомеля»,*
*[2]УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», г. Гомель, Беларусь*
*tflerco@mail.ru, godunina@yandex.by*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Кожнаму чалавеку ад малага да вялікага неабходна ведаць свой край, яго гісторыю, культуру. Навучэнне і выхаванне грамадзяніна і чалавека непарыўна звязана з тым, што называюць малой радзімай – той жмуток зямлі, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, дзе знаходзяцца магілы яго продкаў, дзе ён пазнаў першыя перамогі і няўдачы.

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам дасталася велізарная колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і азёраў, палёў і сенажацяў, урочышчаў і іншых геаграфічных аб’ектаў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш аніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова, без дай прычыны. Геаграфічныя назвы ўзніклі залежаць ад асаблівасцей прыроднага асяроддзя, умоў вытворчай дзейнасці жахароў і вельмі часта ад гістарычнага мінулага чалавека.

Тэма даследавання мікратапанімічнай спадчыны з’яўляецца вельмі актуальнай, так як мікратапанімія валодае велізарным патэнцыялам для вывучэння розных бакоў жыцця народа. Мясцовыя назвы перадаюцца ад пакалення да пакалення людзей амаль бязменна, чым захоўваюць сваю велізарную каштоўнасць.

Разбурэнне тапанімічнага ландшафту мясцовасці, які сфарміраваўся на працягу многіх стагоддзяў, вядзе да страты гістарычнай памяці. У апошні час цікавасць да гісторыі і культуры роднага краю значна ўзрасла, тым больш, што зараз з народнай памяці знікае мноства геаграфічных назваў, бо носьбітамі народнай тапаніміі з’яўляюцца людзі састарэлага ўзросту, якіх застаецца ўсё менш і менш, што павінна турбаваць кожнага. Таму будзе недаравальна, калі на нашым пакаленні згубіцца шматвекавая народная традыцыя памятаць уласныя імёны геаграфічных аб’ектаў, праяў навакольнага асяроддзя. Нельга дапусціць, каб знік гэты пласт народнай культуры. А з дапамогай даследаванняў мы зможам захаваць і перадаць гэтую каштоўнасць наступным пакаленням.

Аб’ектам даследавання была выбрана вёска Раманавічы і яе наваколле, тэрыторыя, якая зусім нядаўна была аднесены да горада Гомеля. Каб не страціць мікратапанімічную спадчыну гэтых цудоўных мясцін намі было вырашана правесці даслеванне гэтай мясцовасці, зафіксаваць гісторыю назваў, якія жывуць ў памяці старэйшых жахароў і данесці атрыманыя вынікі да ўсіх, хто цікавіцца тапанімікай малой радзімы.

Мэта даследвання: вывучыць мікратапанімічныя асаблівасці вёскі Раманавічы і навакольных тэрыторый, садзейнічаць захаванню гістарычнай і культурнай спадчыны Радзімы.

Задачы:

– авалодаць метадамі тапанімічных даследаванняў;
– скласці класіфікацыю тапанімічных назваў вывучаемай тэрыторыі;
– растлумачыць паходжанне геаграфічных назваў вёскі Раманавічы і наваколля;
– нанесці на геаграфічную карту тапанімічныя назвы тэрыторыі даследавання.

У даследаванні прымалі ўдзезел настаўніца геаграфіі сярэдняй школы № 66 г. Гомеля, вучні 11 класа гэтай школы і выкладчыкі кафедры геаграфіі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

Па беларускай мікратапаніміі прыродна-геаграфічнага характару ёсць нямала навуковых і навукова-папулярных публікацый, але ў асноўным яны прысвечаны адносна буйным аб'ектам, а вось дробныя аб'екты вывучаны недастаткова. Асноўныя працы па гэтай тэме належаць вядомым беларускім даследчыкам В. А. Жучкевічу [1], І. А. Яшкіну [2], В. П. Лемцюговай [3]. Даволі падрабязна тапанімія Гомельшчыны разглядаецца ў працах А. Ф. Рогалева, Н. А. Багамольнікавай, Л. П. Кузьміча. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў А. Ф. Рогалевым падрыхтавана некалькі прац па асаблівасцях тапанімічнай спадчыны Гомельшчыны [4, 5].

Падрыхтаваная намі праца ўключае ў сябе тры раздзелы. Першы з іх раскрывае сутнасць асноўных тэрмінаў і змест навуковых тапанімічных даследаванняў, які раней праводзіліся на тэрыторыі рэспублікі. Другі раздзел прысвечаны методыцы даследавання, у ім падрабязна характэрызуецца месца даследавання з геаграфічнага і гістарычнага пункту гледжання. Трэцяя частка ўключае асноўныя вынікі працы: паходжанне, класіфікацыю і змест асноўных геаграфічных назваў вёскі Раманавічы і наваколля.

Навізна нашага даследавання заключаецца ў тым, што мікратопонімы асобнай вёскі дасканала вывучаюцца ўпершыню. Падчас правядзння экспедыцыйнага даследавання было собрана больш за 60 мікратапанімічных назваў на тэррыторыі вёскі Раманавічы і наваколля. Крыніцай і носьбітамі каштоўных ведаў з'уляюцца мясцовыя жыхары. На працягу некалькіх дзен мы сустракаліся і гутарылі з жыхарамірознага ўзросту. Кожны з іх унес нейкія новыя звесткі ў шкарбоку нашых ведаў. Для больш грунтоўных і паслядоўных адказаў была распрацавана спецыяльная анкета, якая ўключала 20 пытанняў аб мясцовых назвах і варыянтах іх тлумачэння. Сабраны матэрыял быў сістэматызаваны і прааналізаваны падчас заняткаў секцыі навуковага таварства «Краязнаўцы» з вучнямі сярэдняй школы № 66 г. Гомеля. Новыя назвы нанесены на картаграфічную аснову.

Было выяўлена паходжанне мясцовых назваў, сярод іх сустракаюцца аронімы, батанічныя і заалагічныя тапонімы, патронімы, гідронімы і іншыя тыпы. Кожная з гэтых назваў ўзнікла на пэўным гістарыяным этапе і адлюстроўвае жыцце, заняткі і побыт жыхароў таго часу. З часам адны геаграфічныя аб'екты зніклі, а другія атрымалі новую назву. Працэс утварэння мікратапонімаў працягваецца і ў наш час.

Асноўная наша мэта на будучыню – працягваць даследаванні невядомых да сённяшняга дня назваў, паспець зафіксаваць іх, не страціць гэтыя гістарычныя каштоўнасці роднага краю разам з састарэлымі жыхарамі. Тэрыторыя вывучэння мікратапонімаў паступова расшыраецца. Найбольшую ўвагу плануецца надаць вёскам, якія зліваюцца з горадам, перарастаюць у новыя мікрараёны, бо разам з новым будаўніцтвам мы губляем сваю гісторыю.

## Спіс літаратуры


1 Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Мн. : БГУ, 1974. – 449 с.

2 Яшкін, І. Я. Беларускія геаграфічныя назвы. Тапаграфія. Гідралогія. / І. Я. Яшкін.– Мн. : Навука і тэхніка, 1971. – 256 с.

3 Лемтюгова, В. П. Восточнославянская ойконимия апеллятивного происхождения: Названия типов поселений. / В. П. Лемтюгова. – Мн. : Наука и техника, 1983. – 200 с.

4 Рогалев, А. Ф. Топонимический словарь Гомеля и Гомельского района. / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2012. – 292 с.

5 Рогалев, А. Ф. Историческая антропонимия Гомеля и окрестностей. / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2009. – 152 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ